Андруковіч Г.А., студ. гр. 402а ФКіСКД
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Пазнякоў А.У.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

# ФОНДЫ БЕЛАРСКАГА ВІЛЕНСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ ІВАНА ЛУЦКЕВІЧА ЯК КРЫНІЦА ДЛЯ АДНАЎЛЕННЯ ЗАМКАЎ БЕЛАРУСІ

У рабоце падымаецца праблема выкарыстання архіўных фондаў, што знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь, перадусім, фондаў Беларускага віленскага музея імя Івана Луцкевіча ў справе аднаўлення і музеефікацыі аб’ектаў абарончай архітэктуры на тэрыторыі Беларусі.

Аўтар аналізуе музейныя зборы на падставе архіўных інвентарных апісанняў і акцэнтуе ўвагу на прыкладах, калі ў замежных архіўных і музейных зборах захоўваюцца выяўленчыя ды апісальныя матэрыялы, якія наўпрост тычацца замкаў Беларусі.[1]

У зборах Нацыянальнага музея Літоўскай Рэспублікі сярод іншых захоўваюцца мастацкія альбомы Язэпа Нарцызавіча Драздовіча, напрыклад, альбом “Мірскі замак” (альбом 1927 г., складаецца з 9 рысункаў пяром, тушшу; нумары 289-297 згодна з Інвентарнай кнігай музея, пададдзел U “Рысункі ручныя – у папках”), з якога ў навуковым і шырокім ужытку маюцца толькі чатыры рысункі.

Мастацкая спадчына Беларускага віленскага музея імя Івана Луцкевіча – тыповы прыклад падзеленай спадчыны, датычна вяртанна якой аўтар разглядае наступныя падыходы:

- рэстытуцыя (вяртанне), поўнае ці частковае;
- капіяванне архіўных і музейных матэрыялаў;
- сумеснае экспанаванне ці частковы дэпазіт;
- спрыяльны рэжым доступу беларускіх даследчыкаў да матэрыялаў. [2]

Аўтар акцэнтуе ўвагу на неабходнасці міждзяржаўнага беларуска-літоўскага пагаднення датычна падзеленых, вывезеных і замежнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паходжання архіўных і музейных фондаў, што наўпрост ці ўскосна тычацца гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь, на прыкладзе фондаў былога Беларускага віленскага музея імя Івана Луцкевіча.

Аўтар прапануе стратэгію даследвання і рэпрэзентацыі, уключэння ў навуковы ды шырокі ўжытак унікальных матэрыялаў, што тычацца аб'екта спадчыны Мірскі замак і іншых падобных аб'ектаў. Дадзеная стратэгія можа і павінная быць выкарыстаная пры рэалізацыі дзяржаўнай праграмы "Замкі Беларусі".

Язэп Драздовіч у зборах БВМ імя І Луцкевіча

214-228 Язэп Драздовіч. Гальшанская гарадзішча, 1929 г. Рыс пяром. Альбом складаецца з 16 рысункаў;

Маецца: 4: 229-233 Язэп Драздовіч. Гара Варганіха. 1927 г. (Дзісеншчына) Рыс. Пяром. Альбом складаецца з 5 рысункаў, туш.

Маецца: 3: 234-247 Язэп Драздовіч. Аўто-Біографія. (Дзісеншчына). Альбом складаецца з 14 рысункаў пяром, туш. 1924 г.; 248-261 Язэп Драздовіч. Лаўрышава і Незьвішча (Наваградчына). Альбом складаецца з 14 рысункаў тушам, пяром. 1927 г.; 262-272 Язэп Драздовіч. Глыбокае. 1925 г. Альбом складаецца з 11 рысункаў вуглём і тэмперай.; 273-288 Язэп Драздовіч. Вільня. 190 г. Альбом складаецца з 16 рысункаў пяром і алавіком.; 289-297 Язэп Драздовіч. Мір. 1927 г. (Наваградчына). Альбом складаецца з 9 рысункаў пяром, туш.; 298-311 Язэп Драздовіч. Трокі – берагі, руіны троцкага берагавога замку, лета 1929 г. Альбом складаецца з 14 рысункаў пяром, туш.; 312-341 Язэп Драздовіч. Трокі-астравец, руіны троцкага астравецкага замку, лета 1929 г. Альбом складаецца з 30 рысункаў пяром, туш і алавіком.; 342-355 Язэп Драздовіч. Ліда. Руіны лідзкага замку. Лета 1929 г.Альбом складаецца з 15 рысункаў пяром-туш.

Маецца: 4: 356-369 Язэп Драздовіч. Крэва. Руіны крэўскага замку лета 1929 г. Альбом складаецца з 14 рысункаў пяром-туш.

Маецца: 8: 370-385 Язэп Драздовіч. Меднікі. Руіны медніцкага замку лета 1929 г. Альбом складаецца з 16 рысункаў пяром-туш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маецца: 1: 386-393 Язэп Драздовіч. Трокі. Руіны троцкага замку астравецкага ў выглядах з далёку лета 1929 г. Альбом складаецца з 8 рысункаў пяром-туш.; 394-405 Язэп Драздовіч. Планы замчышч Наваградскага, Троцкага бяр., Троцкага астр., Медніцкага, Крэўскага і Лідзкага замку. 1929 г. Альбом 2 планаў пяром, туш і акварэль.; 406-410 Язэп Драздовіч. Наваградак і наваградскае замчышча. Планы 1930. Альбом складаецца з 5 рысункаў пяром, туш і акварэль.; 411 Язэп Драздовіч. Наваградскае замчышчэ. 1930 г. План і проспэкт найджаных прадметаў на замчышчы.; 412-423 Язэп Драздовіч. Беларускія тыпы. Альбом 12 рысункаў пяром на кальцы.; 424 Язэп Драздовіч. План Наваградзкага замку. Пяром, туш.; 425 Язэп Драздовіч. Дэкарацыя да п’есы Ф. Аляхновіча “Бутрым Няміра”. 1930 г. Праект дэкор. акварэль.; 426-437 Язэп Драздовіч. Краявіды 1927 г. Альбом 14 рысункаў пяром, туш.; 438-445. Язэп Драздовіч. Альбом зборнага характару. 8 рыс. пяро і вугаль. 1927 г.; 446-461. Язэп Драздовіч. Альбом зборнага характару. 16 рыс. Пяро і алавік. 1923-27 г.; 462-471. Язэп Драздовіч. Альбом зборнага характару 10 рыс. алав. і пяро. 1927 г.; 472-481. Язэп Драздовіч. Тыпы з-пад Галубіцкай пушчы. Дзісеншчына. 1925 г. Альбом 10 рысункаў.; 482-504. Язэп Драздовіч. Альбом кахляў. Рысункі алавіком на 23 аркушах.; 505-571. Язэп Драздовіч. Палесьсе. Піншчына, 1926 г. Альбом складаецца з 67 рысункаў. Зарысоўкі тыпаў, вопраткі, краявідаў і гаспадарскіх прыладаў. І архітэктуры як цэркваў, касьцёлаў,хаты, гумны і стагі. (Разам шэсьдзесят сем рысункаў).; 572-591. Язэп Драздовіч. Ашмяншчына. Сьвірны, хаты і гумны. Л. 1929 г. Альбом 20 рыс. пяром. Туш.; 592-622. Язэп Драздовіч. Альбом 31 рыс. Краявіды, архітэктура, тыпы, гасп. прылады. Рысун. алавік, пяро, туш.; 623-636. Язэп Драздовіч. Альбом 14 рыс. 1926 г. Зарысоўкі тыпаў пяром, туш.; 637-643. Язэп Драздовіч. Альбом 7 рыс. Акварэль. Гарадольня. Малюнкі, апісы, легэнды. 1924 г.; 644-657. Язэп Драздовіч. Альбом 14 рысункаў. Зарысоўкі этнографічных гаспад. прыладаў. Пяро туш. 1926 г.; 658-663. Язэп Драздовіч. Альбом 6 партрэтаў беларускіх князёў XI - XIV ст. Рыс. пяром, туш. 1920 г.; 664 Язэп Драздовіч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ілюстрацыя тыпаў да “Гарадольскай пушчы”. Пяро, туш. 1923 г.; 665-669 Язэп Драздовіч. Старадаўняе будаўніцтва. Рысункі первабытных хат і абаронных вежаў. 5 рысункаў пяром. Туш. 1920 г.; 670-672 Язэп Драздовіч. Віды места Вільні. 3 рысункі туш. пяром. 1924 г.; 673-678 Язэп Драздовіч. Вінэты 6 рысункаў туш. пяром. 1919 г.; 679-690 Язэп Драздовіч. Тыпы. 12 рысункаў пяром, туш. 1929 г.; 691-695 Язэп Драздовіч. Вучаніцы гімназіі ў Вільні. 1924 г. Рысункі пяром. 4 шт. Туш.; 696-701 Язэп Драздовіч. Сьвір. 1924 г. Рысункі гары і возера, алавік і туш. 6 штук рысункаў; 702-720 Язэп Драздовіч. Краявіды. Зарысоўкі вёсак і палёў пяром. Туш 19 рысункаў. 1922-24 год.; 721-726 Язэп Драздовіч. Будаўніцтва. 1927 г. Рысункі сьвятыняў і хатаў пяром, туш. 6 штук.; 727-729 Язэп Драздовіч. Праекты лятучых машын. 3 рысункі пяром, туш.; 730 Язэп Драздовіч. “Хаўтуры” 1924 г. Рысунак пяром (сьмерць брата аўтара).; 731 Язэп Драздовіч. “Дар пушчы”. Рысунак пяром, туш. 1926 г.; 732 Язэп Драздовіч. “Гарадольцы”. 1923 г. Рысунак пяром. Туш.; 733 Язэп Драздовіч. Гальшаны. Від на замкавую капліцу пяром, туш. 1929 г.; 734 Язэп Драздовіч. Пажар гарадышча. Рысунак вуглём і тушам.; 735 Язэп Драздовіч. Кушляны. Нутро старой капліцы. Рысунак пяром, туш

Маецца.: 779-797. Зарысоўкі ўзораў тканін з Наваградчыны. Альбом узораў народных тканін апрцаваных пад кіраўніцтвам Я. Драздовіча, выкананых праз учняў і учаніц Наваграцкай беларускай гімназіі за год 1927-29. 18 экзэмпляраў. [3]

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Рукапіс матэрыялаў навукова-даследчай экспедыцыі ў Вільню за аўтарствам Андруковіч Г.А., Шулаева А.Л.
2. Андруковіч, Г Рэканструкцыя Беларускага віленскага музэя імя Івана Луцкевіча: сучасная праблематыка. // Зборнік дакладаў XXXV студ. навуковай канф. (артыкул знаходзіцца на дэпанацыі).

Інвэнтарная кніга Музэю ім. Ів. Луцкевіча Беларускага Навуковага Таварыства ў Вільні / падрыхт. і публ. У. Крукоўскі // Спадчына. 1995. № 5. – С. 187–190.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ